Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 12 (454)

Сфера

ВЫСОКАЯ СПРАВА

Дзяржава падзякавала бізнесу, што ўкладае ў культуру

УШАНОЎВАННЕ мецэнатаў — адна з нямногіх абсалютных вартасцяў, якія адбываюцца па ініцыятыве Міністэрства культуры, і слова крытыкі не можа быць. Шматлікія прапановы, мерапрыемствы, фестывалі, што маюць месца ў нашай краіне, магчымыя дзякуючы ў тым ліку дапамозе банкаў, прадпрыемстваў, арганізацый, беларускія яны альбо міжнародныя, а таксама пасольстваў. Дык вось ужо восьмы год бачна, што дзяржава гэтую дапамогу цэніць. І адзначае падзякай на адмысловай цырымоніі ўшаноўвання лаўрэатаў рэспубліканскай акцыі «Мецэнат культуры Беларусі», якая гэтым разам адбылася 10 красавіка ў блакітнай зале Палаца прыёмаў.

Фота Андрэя САЗОНАВА.

Больш за тое, па словах міністра культуры Юрыя Бондара, дзяржава бачыць сэнс у далейшай распрацоўцы заканадаўства, у якім будуць закладзены стымулы і заахвочванні для тых, хто займаецца «гэтай высакароднай дзейнасцю».

Па справаздачы міністэрства, у 2018 годзе ў параўнанні з 2017-м аб'ём аказанай дапамогі вырас прыкладна на чатырыста тысяч рублёў і ў выніку склаў амаль сем мільёнаў (6,8, калі быць дакладным). Гэтыя грошы пайшлі, напрыклад, на кінафестываль «Лістапад», форум тэатральнага мастацтва «ТЭАРТ», Калядны конкурс вакалістаў і Калядны оперны форум у Вялікім тэатры (ды і проста новыя пастаноўкі), фестываль Юрыя Башмета, Ноч музеяў у Нацыянальным мастацкім (і асобныя выстаўкі), «Славянскі базар у Віцебску». Далёка хадзіць не трэба: на рэтраспектыву японскага кінакласіка Ясудзіра Одзу. Ды, вядома ж, многія іншыя мерапрыемствы.

Асаблівую нішу займае захаванне нацыянальнай спадчыны, напрыклад, рэстаўрацыя сядзібы Агінскага, бо тут мецэнацтва павінна мець яшчэ больш бескарыслівы настрой. Міністэрства культуры адзначае, што свае спонсары знайшліся і ў справе рамонту Шайцараўскага сельскага Дома культуры, набыцця раяля для Маладзечанскага музычнага каледжа імя Агінскага, абсталявання для Светлагорскага цэнтра культуры. То-бок высакароднае мецэнацтва датычыцца не толькі буйных укладаў у мерапрыемствы — увагі вартая кожная скрыпка.

«За той час, што прайшоў з першай акцыі ў 2012 годзе, бескарыслівая дапамога культуры ў Беларусі стала неад'емнай часткай сацыяльна адказнай дзейнасці айчыннага бізнесу. У імкненні памножыць культурнае багацце краіны і падтрымаць высілкі дзяржавы ў захаванні духоўнай спадчыны ўсе мы разумеем, як важна ўзнаўляць найлепшыя традыцыі мецэнацтва і дабрачыннасці», — сказаў Юрый Бондар на цырымоніі.

Па яго словах, кола спонсараў культуры за апошнія гады пашырылася, а ў цэлым лаўрэатамі акцыі стала больш за сто трыццаць банкаў, прадпрыемстваў, кампаній і прыватных асоб. Шмат якія назвы падчас агучвання лаўрэатаў «Мецэната культуры», што прыемна, гучалі ў гэтым кантэксце не ўпершыню. Падзякі атрымалі Белінвестбанк і «Белавія», Mastercard у Беларусі і «Камунарка», Беларуская чыгунка і Мінскі трактарны завод — усяго каля шасцідзесяці прадстаўнікоў сваіх брэндаў.

Цырымонія не магла абысціся без прадстаўніцтва, напэўна, найбольш заўважнага ў сферы культуры бізнес-гульца — Белгазпрамбанка, што не толькі падтрымлівае чужыя ініцыятывы, але і стварае свае. З сябрам праўлення і дарадцам старшыні праўлення Уладзімірам Сажыным мы пачалі размову з ролі культуры, якую банк для сябе вызначае, і прычынах у ёй зацікаўленасці.

— У шырокім сэнсе ўсё, што робіць чалавек, — гэта культура, у тым ліку такі паважаны кірунак, вельмі папулярны ў Беларусі, як фізічная культура. Грошы робяць жыццё чалавека лепшым у матэрыяльным плане, а культура робіць яго больш эмацыянальна насычаным. Яна, як я гэта для сябе вызначаю, надае жыццю сэнс. Мы хочам, каб людзі вакол нас, асабліва нашы дзеці, не проста жылі ў лепшых матэрыяльных умовах — мы хочам зрабіць лепшай і тую частку, якая датычыцца сапраўдных культурных праяў, у прыватнасці мастацтва. Праз жаданне зрабіць жыццё больш эмацыянальным мы, магчыма, яго і паляпшаем. Нам, як і ўсім, хочацца нечага большага за базавыя патрэбнасці, таму мы падтрымліваем мастацтва ў меру нашага разумення і любові да яго канкрэтных відаў — выяўленчага, якое вучыць нас, што такое праўда і прыгажосць, тэатра, які расказвае пра сучаснае жыццё, бо, напэўна, больш актуальнага мастацтва няма, і агульнай культуры, дабрачыннасці.

— За той час, што вы займаецеся культурай, вы задаволены тым, як працуюць вашы ўкладанні?

— Здаровы канфлікт рухае развіццё, у нас заўсёды ёсць незадаволенасць зробленым, але кірунак падаецца безумоўна правільным. Мы назіраем рост агульнай цікавасці да культуры і нясціпла звязваем нейкую нітачку і са сваёй дзейнасцю, напрыклад, вяртаннем шэрагу карцін мастакоў, якія тут нарадзіліся, на радзіму. Мы надаём гэтай нітачцы важнейшае значэнне, яна мусіць быць працягнута з гістарычнага мінулага ў будучыню праз нашае пакаленне. Гэта нітка неаднаразова, асабліва ў мінулым стагоддзі, перарывалася, а нам бы хацелася, каб людзі разумелі, што яна бесперапынная. Булгакаў казаў, што нітачку можа перарэзаць толькі той, хто яе падвесіў. Грамадства павінна бачыць, што, нягледзячы на ўсе жахі, праз якія прайшлі нашы бацькі і асабліва дзяды, гэта бесперапыннасць культурнага жыцця Беларусі захоўваецца. Чым больш мы будзем падтрымліваць гэтую ўпэўненасць, тым больш будзе сапраўдных грамадзян, што ўспрымаюць сябе не толькі элементам, які прыходзіць і сыходзіць, але і тымі, хто таксама працягвае гэтую самую нітку.

— Па чым вы бачыце, што расце цікавасць да культуры?

— Ва ўсялякім выпадку мне падаецца, ад неразумення сэнсу падобных акцый, як «Мецэнат культуры», з боку дзяржавы мы перайшлі да перыяду, калі гэта безумоўна і глабальна выдзяляецца. Бо ёсць розніца паміж правядзенням культурных акцый і бачаннем у іх сэнсу. Вы бачыце, прыняцце і падтрымка мецэнатаў, тым больш у фармаце падзякі, мае толькі васьмігадовую гісторыю. І потым мы лічым колькасць людзей на нашых мерапрыемствах раней і цяпер і звязваем іх павелічэнне не толькі з ростам дабрабыту ў IT-краіне, але і пашырэннем унутраных патрэб.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ.

Міжнароднае супрацоўніцтва

Беларускія артысты выступяць у чатырох японскіх гарадах

Упершыню за больш чым дваццаць пяць гадоў нашых дыпламатычных стасункаў у Японіі пройдуць Дні культуры Беларусі. Беларуская дэлегацыя наведае чатыры гарады — Токіа, Мацусіму, Сёндай і Сіраісі. Мерапрыемствы, што маюць адбыцца з 18 да 21 красавіка, рыхтуюцца Міністэрствам культуры і нашым пасольствам у Японіі.

— Іх галоўная мэта — дэманстрацыя і папулярызацыя беларускай культуры, а таксама замацаванне іміджу нашай краіны, — адзначыў прадстаўнік Міністэрства культуры Васіль Галаван.

Гэтым разам прадстаўляць Беларусь за мяжой будзе творчы калектыў «Тэатр песні Ірыны Дарафеевай». У яго ўваходзяць пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў спявачка Ірына Дарафеева, саліст акадэмічнага народнага аркестра імя Іосіфа Жыновіча Андрэй Коласаў, лаўрэат шматлікіх фестываляў Дар'я Хмяльніцкая ды гурт «Прыгажуні».

— Ведаючы, наколькі Японія вялікая, прыгожая, развітая ў тэхнічным плане краіна, хочацца максімальна ярка прадставіць часцінку беларускай культуры, падзяліцца цеплынёй і сардэчнасцю нашых людзей, — сказала Ірына Дарафеева. — Я думаю, што менавіта музыка з'яўляецца той мовай, якая дазволіць лепш зразумець адзін аднаго і пабудаваць далейшыя стасункі.

Па словах Ірыны Дарафеевай, праграма будзе насычанай, маштабнай і непаўторнай. Калектыў прадставіць беларускамоўны рэпертуар (пераклад песень будзе паказвацца на экранах падчас выступлення), але выканае і некалькі вядомых японскіх кампазіцый. Разынкай канцэртаў стануць адметныя аўтарскія нацыянальныя касцюмы, створаныя беларускім дызайнерам Настассяй Фальковіч.

У Японію артысты едуць і з дыпламатычнай місіяй: Ірына Дарафеева прадставіць інтарэсы Беларусі як дэпутат беларускага парламента і паўдзельнічае ў перамовах з міністрам адукацыі, культуры, спорту, навукі і тэхналогій Масахіка Сібаямам, кіраўніком групы міжпарламенцкай дружбы Японіі і Беларусі, міністрам па ўзнаўленні Японіі Хіраміці Ватанабэ і іншымі палітыкамі.

Падчас гэтых сустрэч, як мяркуецца, будуць закранутыя тэмы арганізацыі тэматычных канцэртаў, прысвечаных Еўрапейскім гульням у Мінску і Параалімпійскім гульням у Токіа, цырымоніі ўскладання кветак да манумента ахвярам прыродных бедстваў 2011 года ў рэгіёне Такоху і мерапрыемствам да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Юлія АДАМОВІЧ.

На сцэне

УВАГА, ШТРАУС

Вялікі тэатр упершыню з 1960-х ставіць аперэту

«Опера звычайна канчаецца смерцю, а тут канец увесь у любові». У Вялікім тэатры оперы і балета рыхтуецца прэм'ера знакамітай аўстрыйскай аперэты Іагана Штрауса «Лятучая мыш». Вялікі звярнуўся да жанра аперэты — «не самую высокую гару тэатральнага мастацтва, на якую тым не менш вельмі складана ўзабрацца» — упершыню з 1960-х гадоў. У прыватнасці «Лятучая мыш», над якой тады працавалі рэжысёр Вячаслаў Броўкін і дырыжор Таццяна Каламійцава, была першы і апошні раз пастаўлена ў 1961 годзе. Гэтым разам пастаноўку робіць міжнародная каманда на чале з венгерскім рэжысёрам-пастаноўшчыкам Міклашам Габарам Керэны і дырыжорам з Італіі Джанлука Марчана.

Фота Міхаіла НЕСЦЕРАВА.

Прэм'ера «Лятучая мыш», спачатку не вельмі паспяховая, адбылася ў 1874 годзе ў венскім тэатры «Ан дэр Він», які існуе і сёння. Іаган Штраус быў адным з тых, хто распрацоўваў французскі жанр на аўстрыйскім матэрыяле — ён напісаў шаснаццаць аперэт, але няшмат з іх увайшлі ў кола безумоўных музычных каштоўнасцяў. Камедыйная «Лятучая мыш», хоць па першым часе і не сустрэла асаблівага энтузіязму, з паўторнымі пастаноўкамі прагучала даволі гучна і ў выніку разышлася па ўсім свеце.

У сюжэце задзейнічаны сужэнцы Разалінда і Айзенштайн, іх пакаёўка Адэль, закаханы ў Разалінду Альфрэд, дырэктар турмы Франк, гаспадар балю князь Арлоўскі і нарэшце доктар Фальк, які хоча адпомсціць за мінулагоднее прыніжэнне. Лятучая мыш — гэта маскарадны касцюм, у якім п'янага Фалька пакінулі на лаўцы цэнтральнай плошчы і ў якім раніцай ён вымушаны быў смяшыць людзей.

З помсты ён выстаўляе гасцей балю тымі, кім яны не з'яўляюцца, але кім яны з розных прычын гатовы прыкідвацца, каб крыўдзіцель у выніку апынуўся ў такім жа смешным становішчы, у якім некалі Фальк.

Аперэту ў Вялікім ставіць міжнародная каманда — рэжысёра Керэны суправаджаюць мастак-пастаноўшчык па сцэнаграфіі Тамаш Ракаі, мастак-пастаноўшчык па касцюмах Агнеш Ева Дзермаці і мастак па святле Петэр Шомфаі таксама з Венгрыі. Дырыжор-пастаноўшчык Джанлука Марчана, як ужо было згадана, прыехаў з Італіі, а хормайстрам-пастаноўшчыкам стала народная артыстка Беларусі Ніна Ламановіч.

«Наша каманда шмат працуе ў розных пунктах свету, і паўсюль для нас вельмі важна, каб там, дзе мы зараз знаходзімся, глядзельная зала атрымала тое, у што яна пасапраўднаму закахаецца, — сказаў Міклаш Габар Керэны. — Нешта, што глядач убачыць і наступнай раніцай, калі паглядзіцца ў люстэрка, успомніць у сувязі з тым, як добра яму было мінулым вечарам. У дачыненні да чаго ён скажа: «А я ж сябе ў гэтым спектаклі пазнаў!» Мяне заўсёды хвалюе, каб разам з забавай глядач мог таксама падумаць у тэатры, каб пастаноўку можна было ўспрымаць на розных узроўнях, каб у глядзельнай зале аднолькава атрымлівалі задавальненне прафесар медыцыны, прадавец у прадуктовай краме і трынаццацігадовае дзіця».

Рэжысёр таксама адзначыў свой дуэт з Джанлука Марчана, з якім яны «аднолькава глядзяць на крайнасці і прыгажосць сваёй справы і абодва не любяць красавацца». Галоўныя партыі ў «Лятучай мышы» выканаюць вядучыя салісты Вялікага. Тэатр асабліва адзначыў і свайго роду «фішку» пастаноўкі: у ролі турэмнага вартаўніка Фроша выступіць заслужаны артыст Беларусі Уладзімір Радзівілаў.

Аперэта — для мінскай пастаноўкі, дарэчы, створана адмысловае лібрэта, у чым паўдзельнічаў і рэжысёр, — будзе гучаць на рускай мове. Яе прэм'ера адбудзецца ў Вялікім ужо 16 красавіка.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ.

Культасвета

«А ЧЫТАЦЬ ХТО БУДЗЕ — ПУШКІН?»

Чаму варта не прапусціць «Бібліяноч-2019»

19 красавіка а сёмай вечара ў сямі бібліятэках сталіцы пачнецца «Бібліяноч» — адзіны дзень у годзе, калі чытальні працуюць да ночы і завабліваюць наведвальнікаў адмысловымі праграмамі. Акцыя па папулярызацыі чытання «Бібліяноч» упершыню прайшла ў нашай краіне ў 2015-м — і стала штогадовай.

Сёлета **Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук** ператворыцца ў лабараторыю і паспрабуе вывесці сваю формулу «Бібліяночы»: тут правядуць нясумныя навуковыя лекцыі і творчыя майстэрні, пакажуць калейдаскоп унікальных старадаўніх кніг і інтэрактыўныя кніжныя выстаўкі, а таксама паставяць кулінарна-алхімічныя вопыты.

Цэнтральная бібліятэка імя Янкі Купалы і **Фундаментальная бібліятэка БДУ** абралі творчы кірунак: тэатральныя пастаноўкі і знаёмства з закуліссем, паэтычныя і музычныя імпрэзы, сустрэчы з людзьмі тэатральных прафесій.

Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка, якая далучылася да акцыі ўпершыню сумесна з **Рэспубліканскай навуковай медыцынскай бібліятэкай**, узяла максімальна блізкі для сябе кірунак «Аграсядзіба запрашае...». У праграме вечара — інтэлектуальныя гульні і бардаўскія спевы, майстар-клас па вырабе з друсаной сыравіны ўпрыгожанняў для раслін, урокі бальных танцаў, а для тых, хто прытаміўся, — пасядзелкі з блінамі і чаем.

У **Навуковай бібліятэцы БНТУ** гасцям прапануюць узяць удзел у вясёлых прадстаўленнях, навуковых лекцыях, актыўных забавах ад літаратурных фан-дамоў, у настольных гульнях або майстар-класе ад рэжысёра Аляксандры Бутар, якая раскажа, як напісаць сцэнарый. Дарэчы, тут свята працягнецца і 20 красавіка — на пятым гарадскім фестывалі «Горад і Кнігі».

«Пушкіну і не снілася», — інтрыгуе афіша акцыі **Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта**. Супрацоўнікі тутэйшай бібліятэкі падрыхтавалі квэст «Лукамор'е» паводле твораў класіка рускай літаратуры, юбілей якога адзначаецца сёлета, а таксама склалі праграму «пушкінскіх» мультфільмаў, сеанс казкатэрапіі і творчыя майстар-класы, дзе можна навучыцца, напрыклад, зрабіць арыгамі — казачнага персанажа ці намаляваць паштоўку, і прадугледзелі нават адмысловую кавярню «У Арыны Радзівонаўны».

А **Нацыянальная бібліятэка Беларусі** назвала свой маштабны праект «БібліяLIVE» — і абяцае акунуць кожнага наведвальніка ў бурлівы вір жыцця: музыка, віктарыны, модны паказ, майстар-класы, трэнінгі з удзелам псіхолагаў, дзіцячая пляцоўка і адмысловая YouTube-вечарынка... На кожнай пляцоўцы прадугледжаны свае цікавінкі і сюрпрызы: напрыклад, турнір па шахматах пройдзе з гіганцкімі фігурамі, а на дабрачыннай пляцоўцы, якую зладзяць сумесна ГА «Эгіда», кожны ахвотны зможа знайсці сабе новага сябра альбо дапамагчы прытулкам для жывёл. Самай настальгічнай абяцае стаць пляцоўка «Вінілавы рай» — на вінтажным прайгравальніку будуць гучаць старыя, але мілыя сэрцу пласцінкі...

Цалкам з праграмай «Бібліяночы» ў кожнай бібліятэцы можна азнаёміцца ў афіцыйнай суполцы акцыі «УКантакце» https://vk.com/biblionoch_minsk.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Кінакрокі

НЕПРАКЛАДЗЕНЫЯ СЦЕЖКІ

У «Беларусьфільма» тры інфармацыйныя нагоды і ўсе аб новых фарматах

На гэтым тыдні Нацыянальная кінастудыя прадэманстравала сваё «пераарыентаванне». У адзін дзень запусціла свой першы сіткам пад рабочай назвай «Ілюзіі», абвясціла аб хуткім завяршэнні першай поўнаметражнай анімацыйнай карціны «Зоркі сёмага неба» і назвала пераможцаў конкурсу на сцэнарый зноў жа анімацыйнага фільма ў фармаце поўнага метра. Конкурс таксама быў праведзены ўпершыню. «Беларусьфільм» ідзе непракладзенымі сцежкамі, чым, напэўна, намагаецца абвергнуць некампліментарныя стэрэатыпы пра сябе. Што з гэтага атрымаецца і ці набудзе ўстанова новую форму, гледачу яшчэ давядзецца пабачыць.

ІМІДЖ НАПЕРАД

Уладзімір Карачэўскі толькі крыху больш за год працуе на пасадзе дырэктара Нацыянальнай кінастудыі, а на прэс-канферэнцыях абвяшчаюць новае і новае. То ўдзел у капрадукцыйных праектах, то далучэнне да Індустрыяльнай платформы кінафестывалю «Лістапад», то стварэнне экскурсійных маршрутаў па кінамясцінах Мінска, то серыя паказаў дакументальных фільмаў «Час «Летапісу» ў кінатэатры «Піянер», то, нарэшце, кінафарматы, якія «Беларусьфільм» асвойвае ўпершыню.

Прамільгнула і навіна пра наведванне кінастудыі кіраўнікамі і жонкамі кіраўнікоў дыпламатычных місій напярэдадні 8 Сакавіка — штогадовая сустрэча, якую арганізуе жонка міністра замежных спраў Вера Палякова-Макей, гэтым разам прайшла на «Беларусьфільме», сярод касцюмаў і ружжаў з піратэхнічнага аддзела. То-бок, бачна, што работа над іміджам вядзецца.

Хоць зразумела, кінастудыя ў першую чаргу ацэньваецца па сваіх работах, а кінапракат апошнім часам яна парадавала толькі «Жыццём пасля жыцця» Дзмітрыя Астрахана і «Чорным сабакам» па кнізе Мікалая Чаргінца. Другая карціна, дарэчы, пасля паказаў на тэлеканале НТВ 11 красавіка выйшла ў мінскі пракат (рэспубліканскі конкурс кінапраектаў усё прадугледжвае і прапануе ствараць дзве версіі фільма — чатыры серыі для тэлебачання, спадзяюцца, расійскага, і поўны метр для вялікага экрана, ужо беларускага).

Пераарыентаванне ж — працэс доўгі, перанастройка канвеера буйной кінафабрыкі вымагае часу, а пакуль можна браць экскурсіямі. Мы чакаем, ці адзначыцца новая вяха кінастудыйнай гісторыі ў фільме пра Янку Купалу і экранізацыі «Авантур Пранціша Вырвіча» Людмілы Рублеўскай, а «Беларусьфільм» тым часам нават перавышае чаканні і пачынае камедыйны серыял. Як бы адказваючы на запыт сучаснага гледача.

ДАРОГУ МАЛАДЫМ

Таму шмат што гэтымі днямі тут здараецца ўпершыню. Першыя здымкі «Ілюзій» у павільёне «Беларусьфільма» прайшлі 9 красавіка. Гэта будзе шаснаццацісерыйны (па 26 хвілін) камедыйны маладзёжны серыял, у якім шэсць герояў павінны хутка паставіць паспяховы спектакль, каб выратаваць студэнцкі тэатр ад закрыцця.

Да таго ж аказалася, што пасля сарака гадоў існавання студыі анімацыйнага кіно яна здольная на поўны метр. Маецца на ўвазе фільм, які адразу робіцца як поўны метр, а не складаецца з кароткаметражных частак. Работа над першым — «Зоркі сёмага неба» — вядзецца ўжо некалькі гадоў.

«Кінастудыя пераарыентавала сваю палітыку: цяпер мы працуем не толькі з мэтрамі і вядомымі людзьмі, але і актыўна — з моладдзю. Прыкладам з'яўляецца наша рэпертуарная палітыка: мы пачалі здымаць маладзёжны сіткам, у якім удзельнічаюць акцёры, што альбо год-два таму скончылі Акадэмію мастацтваў, альбо яшчэ вучацца, ствараюцца альманахі ігравога і дакументальнага кіно, дзе рэжысёрамі выступаюць дэбютанты, над нашымі анімацыйнымі фільмамі працуюць у тым ліку маладыя мастакі-аніматары і рэжысёры-аніматары», — расказвае Уладзімір Карачэўскі.

Адзінае, што здымаюцца ў сіткаме ўчарашнія студэнты, ну, тут па сюжэце прадугледжана, а рэжысёрскае крэсла маладому не даверылі: аддалі майстру Івану Паўлаву. У стварэнні «Зорак сёмага неба» маладыя задзейнічаны, а кіраўніцтва праектам узяла на сябе ўжо вядомы рэжысёр Алена Турава, дачка Віктара Турава і аўтар «Рыжыка ў Залюстроўі» і «Кіндэр-Вілейскага прывіда». Яна ж займецца работай над, лічы, другой поўнаметражнай анімацыйнай карцінай па сцэнарыі-пераможцы ўжо згаданага маладзёжнага конкурсу.

Як ні круці, кінастудыя немінуча агаляе праблему сучаснага беларускага кіно — майстры ёсць, а замены ім няма, у буйныя праекты нам няма каго прапанаваць. І справа тут не ў палітыцы «Беларусьфільма», куды ты яе ні арыентуй, а ў тым, што ў свой час наша кінаіндустрыя ўпусціла нешта важнае.

СТАРАЖЫТНАСЛАВЯНСКІЯ БАГІ

З дваццаці пададзеных на конкурс сцэнарыяў заявак і трынаццаці дапушчаных да разгляду журы найлепшым быў прызнаны сюжэт «Песня Сірын» Сяргея Рагатка, у якім задзейнічаны пантэон старажытнаславянскіх багоў і міфалагічных істот — уласна птушка Сірын, Вялес, Пярун, Макоша, Купала і Кастрама, Паляндра, Дуб Светабудовы ды іншыя.

Два хлопчыкі па дарозе на дачу сустракаюць дзіўную птушку, якая крадзе тэлефон аднаго з іх. У пошуках апарата галоўныя героі становяцца сведкамі неверагодных падзей і мусяць прадухіліць знішчэнне Ніжняга, Верхняга і Пасярэдняга светаў.

«Кінастудыя паварочваецца і ў бок гледача. Апроч фестывальнага інтарэсу, нам важна, каб у аўдыторыі была зацікаўленасць. Каб людзі, якія сустракаюць супрацоўніка кінастудыі на вуліцы і даведваюцца, што ён там працуе, не пыталіся: «А што, яна яшчэ існуе?» Мы хацелі б, каб тое, што мы робім, знаходзіла водгук у беларускага гледача, каб ён ведаў, што мы робім, і пазнаваў персанажаў», — кажа Алена Турава.

Сцэнарый «Песні Сірын» ператворыцца ў фільм, а два ўдзельнікі, якіх журы вырашыла адзначыць заахвочвальнымі прызамі («Пенаты» Алены Зміцер і «Залаты яблык» Станіслава Сабалеўскага), застануцца ў сцэнарным партфелі кінастудыі.

У што б згаданыя «першыя» ініцыятывы не выліліся, у калідорах студыі ўпершыню за некалькі гадоў узнікае прыемнае адчуванне, што «кінафабрыка» разам з усімі няўдачамі, прынамсі, прыкладае намаганні да таго, каб пераламіць песімістычную традыцыю.

Атрымаецца папулярны сіткам ці не, ацэніць глядач поўнаметражную беларусьфільмаўскую анімацыю альбо праігнаруе, магчыма, адна з навінак кінастудыі спрацуе і скажа, што на «Беларусьфільме» прыйшлі лепшыя часы.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ.